І мы там былі

# «ЗОРНЫ КАРАГОД», ФЭСТ «ЛЯНОК» І «ГАРМОНІЯ ШКЛА»

## Больш за дваццаць мерапрыемстваў адбылося падчас Нацыянальнага фестывалю «Маладзечна-2019»

**Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне даўно стаў брэндам Мінскай вобласці і з часам выйшаў на міжнародны ўзровень. Сёлета свята прайшло ў дзевятнаццаты раз. Прысвечанае яно Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дадам, што адметнасць гэтага фестывалю ў тым, што тут гучыць толькі жывая музыка. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў Маладзечне і акунулася ў атмасферу форуму.**

На два дні, 7 і 8 чэрвеня, упрыгожаны, нібыта памаладзелы горад стаў адной вялікай сцэнічнай пляцоўкай. Даў старт фестывалю Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр пад кіраўніцтвам маэстра Фінберга. У канцэртнай зале Палаца культуры адбыўся трэці тур рэспубліканскага этапу конкурсу маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. Летась, дарэчы, Гран-пры імя Уладзіміра Мулявіна не прысуджалася. Сёлета ўладальніцай галоўнай узнагароды стала 18-гадовая Яна Мармыш.

Усяго падчас музычнага форуму жыхарам і гасцям горада было прадстаўлена больш за 20 мерапрыемстваў. Прычым яны былі разлічаны на людзей розных густаў і ўзростаў. Так, напрыклад, ветэраны вайны, людзі старэйшага пакалення акунуліся ў тыя страшныя і адначасова гераічныя ваенныя часы на канцэртнай праграме «Песні вайны». Найлепшыя кампазіцыі, напісаныя ў ваенны і пасляваенны перыяд, якія сталі па-сапраўднаму народнымі, выканалі для іх таленавітыя артысты Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Гэтыя творы нікога не пакінулі абыякавымі, на вачах многіх гледачоў былі слёзы. А ў выставачнай зале Палаца культуры Беларускі саюз жанчын прэзентаваў фотавыстаўку «Беларусь помніць. Жаночы твар Перамогі» і серыю кніг пра Вялікую Айчынную вайну. Нацыянальны гістарычны музей пазнаёміў наведвальнікаў з гісторыяй вызвалення краіны праз дакументы, франтавы жывапіс, графіку, ваенныя здымкі і газеты.

На працягу двух фестывальных дзён працавалі адкрытыя пляцоўкі на Цэнтральнай плошчы, вуліцы Прытыцкага, у гарадскім парку культуры і адпачынку імя Перамогі. Так, «Фестывальная талака» прапанавала гледачам выступленні творчых калектываў Маладзечанскага рэгіёна. На пляцоўцы «Фестывальная сядзіба» народныя майстры, умельцы горада і раёна прадставілі работы дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва.

Шмат людзей было на арт-фэсце «ЛянОК». У ім удзельнічалі прадпрыемствы льняной галіны з Маладзечна, Віцебскай, Мінскай, Гродзенскай абласцей, рамеснікі, дызайнеры. Падчас фэсту прайшла дэманстрацыя новых мадэляў адзення з беларускага лёну, была наладжана выстаўка-продаж вырабаў, аксесуараў з гэтай шаўкавістай расліны.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У час запісу папулярнай аўтарскай праграмы Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА «Суразмоўцы», які адбыўся на адной з фестывальных пляцовак.

Сёмы абласны фестываль сямейнай творчасці «У добрым родзе ўсё ў згодзе» сабраў 26 калектываў з 14 раёнаў Міншчыны. Паказаць сваё майстэрства ў спевах, танцах, вырабе розных упрыгажэнняў, прадметаў быту прыехалі і маладыя сем'і, і дынастыі. Напрыклад, сямейны калектыў «Крона» з пасёлка Ракаў вядомы далёка за межамі Валожынскага раёна. У ім спяваюць сёстры, іх дзеці, унукі.




На сцэне ў цэнтры Маладзечна выступалі прафесійныя і аматарскія калектывы.

Мінскі абласны краязнаўчы музей запрасіў усіх ахвотных на выстаўку мастацкіх вырабаў «Гармонія шкла». Аўтары твораў Таццяна і Пётр Арцёмавы акунулі наведвальнікаў у чароўны свет шкла. Для аматараў цёплых сустрэч і задушэўных размоў трэці год запар ладзіцца праект «Асоба эпохі», дзе гераінямі становяцца жанчыны, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё айчыннага мастацтва. Гэтым разам прыхільнікі змаглі бліжэй пазнаёміцца з творчасцю заслужанай артысткі Беларусі спявачкі Надзеі Мікуліч, задаць ёй пытанні.

Для дзяцей і моладзі працавалі творчыя пляцоўкі «Тэрыторыя дзяцінства» і «Арт-старт». А канцэртная зала Маладзечанскай дзіцячай школы мастацтваў запрасіла ўсіх ахвотных на пляцоўку «Мой родны кут, як ты мне мілы», дзе можна было сустрэцца з любімымі беларускімі паэтамі, паслухаць у іх выкананні вершы.

Завяршэннем свята стаў вялікі юбілейны гала-канцэрт «Зорны карагод» на галоўнай пляцоўцы — летнім амфітэатры — Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі пад кіраўніцтвам Валянціна Дудкевіча. У канцэрце таксама ўдзельнічалі артысты беларускай эстрады: Ірына Дарафеева, Алена Ланская, Аляксандр Саладуха, Юлія Быкава, ансамбль «Песняры» і іншыя. Лейтматыў мерапрыемства — творчая садружнасць ансамбля з найлепшымі выканаўцамі краіны, якая складаецца ў зорную повязь.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ПУРПУРНЫ, СІНІ, ЛІЛОВЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Пяць год таму я захапілася жыццём Элізы Ажэшкі, бо мела задачу напісаць артыкул для гістарычнай рубрыкі, якую вяла ў глянцавым часопісе, — расказвае Святлана Воцінава. — Штосьці мяне зачапіла, і я працягнула цікавіцца акалічнасцямі яе жыцця. Чытаючы ўсё болей лістоў, успамінаў, твораў, я пачала заўважаць некаторыя «белыя плямы», пытанні, на якія хацелася знайсці адказы — наватт для самой сябе. Стала цікава: якім яна была чалавекам? Хацелася ведаць усё да дробязяў: звычкі, густы, голас, паходку, сава яна была ці жаваранак, што любіла піць — гарбату ці каву, мела ахвоту да салодкага ці да салёнага... Як гэта можна даведацца, калі нідзе не адзначана? Дзякуючы біялагічнай адукацыі і даўняму захапленню гамеапатыяй я вырашыла паспрабаваць скарыстаць гэты метад для вызначэння яе канстытуцыянальнага тыпу, а праз яго — раскрыць астатняе.



Сабрала ўсю інфармацыю пра пісьменніцу, нібыта пра пацыентку, якая павінна трапіць на прыём да ўрача: знешнасць — фігура і рысы твару, бо ў гамеапатыі гэта важна: скаргі на стан здароўя і дыягназы, якія ставілі ёй урачы, — для гамеапата гэта галоўнае; многае з таго, што вядома пра характар, і іншае. Усё гэта я прадставіла доктару. Ідэя спрацавала: інфармацыя дазволіла вызначыць тып — *Natrum muriaticum* (ад лацінскага «кухонная соль». — **Аўт.**). Паколькі на ўсе канстытуцыянальныя тыпы існуюць даволі падрабязна прапісаныя «партрэты» — з пералікам як знешніх, так і ўнутраных якасцяў, магчымых звычак, пераваг, схільнасцяў і гэтак далей, то лёгка было ўжо вызначыць тое, што з'яўлялася невядомым.

Такім чынам, Эліза Ажэшка любіла гарбату, салодкае ела рэдка, дыкцыю мела не заўсёды выразную, асабліва калі хвалявалася, хадзіла так, што абцасы сціраліся хутка, спрыту ў рухах не мела, любімымі колерамі былі шэры, сіні, чорны, але асабліва — лілова або пурпурны. Усяму гэтаму можна было і не верыць — занадта фантастычна выглядае сама магчымасць такога ведання. Але ўявіце маё ўзрушэнне, калі трошкі пазней я выпадкова даведалася, якога колеру сукенка была на Элізе Ажэшцы на святкаванні яе 50-гадовага юбілею, паводле ўспамінаў госці Стэфаніі Сэмпалоўскай: пурпурная! І пурпурныя кветкі былі ў прычоссы. Потым я заўважыла, што і ў гербарыях, складзеных ёю, пераважаюць падобныя адценні — фіялетавы, сіні, ружовы... Да таго ж, забыўшыся даць гамеапату інфармацыю пра хворыя вочы, атрымала ў пераліку магчымых дыягназаў хваробы вачэй. Вынікі надалі смеласці: я ўжо магла бачыць яе як жывога чалавека, а не як абстрактны вобраз.

Паступова пачала знаходзіць і пэўныя супярэчнасці паміж тым, што выяўлена, вычытана і прааналізавана мною, і тым, што я знаходзіла пра яе ў артыкулах іншых даследчыкаў. Некаторыя высновы папярэдніх біёграфаў здаваліся мне досыць дзіўнымі, да таго ж яшчэ і неабгрунтаванымі або з такімі абгрунтаваннямі, якія пярэчаць і логіцы, і фактам. Я стала «капаць» далей, каб знайсці доказы або абвяржэнні тых высноў, да якіх прыйшла: маю рацыю ці памыляюся, бо ўсё ж як ні круці, а спрабую спрачацца з аўтарытэтамі, кідаю ім выклік... Паступова захапілася яшчэ больш, канчаткова пагрузілася ў тэму.



Усе, хто нешта мае сказаць пра Элізу Ажэшку, глядзяць на яе найперш як на пісьменніцу, а мяне яна цікавіць як чалавек. У яе творах, якія я чытаю не менш апантана, чым эпісталярый і мемуары, я назіраю, наколькі моцна адбіваліся ў іх акалічнасці яе жыцця.

Адна з апошніх маіх знаходак датычыцца пытання, чаму яна выбрала Пятра Ажэшку, а не іншых прэтэндэнтаў, якія прасілі яе рукі. Вядома, што на выбар паўплывала меркаванне маці юнай Элізы, тым не менш яна і сама пісала, што Пётр падабаўся ёй «больш, чым паны X, Y, Z». Псіхафізіялагічны аспект такой сімпатыі хаваецца ў адной з кніг, прачытаных ёю ў падлеткавым узросце. Вобраз галоўнага героя ўпячатаўся ў памяць у момант моцнага эмацыянальнага ўзрушэння, а Пётр аказаўся вельмі да гэтага героя падобным.

...Ідэя правесці цыкл адкрытых лекцый узнікла таму, што назапасілася досыць інфармацыі, якую трэба неяк выкарыстоўваць. Я напісала пісаць кнігу, аднак справа гэта доўгая, і калі кніга можа быць выдадзена, невядома. А з дапамогай лекцый плануваю хутка распавесці ўсё, што будзе ў ёй напісана. Я расказваю не толькі тое, што можна прачытаць у розных крыніцах, але і тое, што я «раскапала» сама і што немагчыма пакуль што нідзе прачытаць. Крыху карэктую папярэднія меркаванні пра яе дзяцінства, пра маму, айчыма, першага мужа, каханага мужчыну. Доказна выпраўляю некаторыя даты: напрыклад, гады вучобы ў пансіёне пры Варшаўскім манастыры не 1852—1857, як пішацца ва ўспамінах і паўтараецца ў артыкулах, а 1851—1856. Я думаю, што Эліза наўмысна зрабіла такую фальсіфікацыю, і тлумачу яе прычыну, якая звязана з яшчэ адной ідэяй-фікс пані Элізы — яна называла годам свайго нараджэння не 1841, а 1842. Іншымі словамі, мне вельмі захацелася падзяліцца сваімі знаходкамі і меркаваннямі.

На публічнае чытанне лекцый мяне натхнілі пабачаныя на ютубе ролікі пра «(Не) расстраляную паэзію». У іх аўтары чытаюць лекцыі пра (не)расстраляных паэтаў. Гэта і было штуршком: я падумала, што мне таксама ёсць што сказаць — пра жыццё Элізы Ажэшкі, такое яркае, складанае, цікавае. Агулам атрымалася сем асобных тэм, у якіх прасочваюцца і жыццё, і творчасць, і пачуцці. Парадак пры гэтым храналагічны — першая лекцыя прысвечана дзяцінству, а заключная мае назву «Апошняе сонца».

Варта дадаць, што адшуканым цікавым матэрыялам пра самую вядомую гарадзенку мінулага Святлана Воцінава будзе дзяліцца падчас публічных лекцый — кожную сераду чэрвеня і ліпеня (акрамя 3-га чысла) у сталічным Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры з 18 да 20 гадзін. Уваход — па квітку ў музей.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**